# ПАШПАРТ ДЫСЦЫПЛІНЫ
# ГЕАГРАФІЯ БЕЛАРУСІ (ФІЗІЧНАЯ).

**Курс "Геаграфія Беларусі (частка 1. Фізічная)" для студэнтаў спецыяльнасцяў 1 31 02 01 "Геаграфія (па накірунках)" і 1 33 01 02 "Геаэкалогія"**

**4 курс, 7 семестр**
**Агульная колькасць гадзін – 130**
**Аўдыторных - 68**
**Лекцыі – 34**
**Практычныя і семінарскія заняткі – 22**
**КСР - 12**

**Выкладчыкі:**
**БРЫЛЕЎСКІ МІХАІЛ МІКАЛАЕВІЧ – дацэнт, кандыдат геаграфічных навук (лекцыйны курс)**
**МАРОЗАЎ ЯЎГЕН УЛАДЗІМІРАВІЧ – старэйшы выкладчык (практычныя і семінарскія заняткі)**

## Анатацыя курса.

Курс фізічнай геаграфіі Беларусі арыянтаваны на вывучэнне асаблівасцей прыроды роднага краю. У ім прадугледжана вывучэнне асобных прыродных кампанентаў: нетраў і карысных выкапняў, рэльефа, клімата і надвор'я, рэк, азёр, каналаў і вадасховішчаў, глеб, расліннага покрыва і жывёльнага свету, а таксама ўзаемасувязяў паміж імі. Разглядаюцца пытанні гісторыі даследаванняў прыроды рэспублікі, прыводзіцца характарыстыка асобных фізіка-геаграфічных рэгіёнаў, а таксама асаблівасці іх ландшафтнай структуры. Шмат увагі ўдзяляецца пытанням рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў і аховы прыроды. Разглядаюцца сучасныя экалагічныя праблемы, прыводзіцца прагноз развіцця прыродных працэсаў.

Курс з'яўляецца з аднаго боку сінтэзуючым: у ім абагульняюцца веды, што атрымалі студэнты пры вывучэнні асобных прыродных кампанентаў, з другога – базавым для курса эканамічная геаграфія Беларусі.